## НАВУКА. АСОБА. ТРАДЫЦЫЯ

У 2013 г. у выдавецтве «Тэхналогія» ўбачыла свет манаграфія «Міф. Прастора. Чалавек: традыцыйны культурны ландшафт беларусаў у семіятычнай перспектыве» беларускага этнолага, спецыяліста ў галіне этнасеміётыкі Уладзіміра Лобача. Выданне падсумоўвае шматгадовую працу аўтара па вывучэнні міфасемантыкі традыцыйнага культурнага ландшафту Беларусі, пра што сведчыць значная колькасць публікацый[1].

Даследаванне ахоплівае вельмі важны сегмент традыцыйнай народнай культуры – прасторава-ландшафтны код і разам з артыкуламі аўтараў энцыклапедычнага слоўніка «Міфалогія беларусаў» (2011), манаграфіямі І. Швед (2004, 2006, 2011), Т. Валодзінай (2009) плённа развівае семіялагічны і кагніталагічны кірунак у беларускай гуманітарыстыцы.

Ва ўводзінах і першай главе аўтар указвае на канцэптуальнае значэнне сваёй тэмы, паводле якога менавіта традыцыйны культурны ландшафт адыгрывае вялікую ролю ў культарагенезе любога народа і прадметна ўвасабляе самабытнасць кожнай этнічнай традыцыі (с. 6–7). Для вывучэння яго міфасемантыкі (структуры, сімволікі і рытуальных функцый базавых элементаў) і ўлучанасці ў карціну свету У. Лобач аналізуе розныя тэарэтыка-метадалагічныя падыходы да асэнсавання прасторы ў культуры, распрацаваныя ў свой час прадстаўнікамі амерыканскай сацыяантрапалогіі, культурнай геаграфіі, гісторыкамі французскай школы «Аналаў», структуралізму і культурнай антрапалогіі, даследчыкамі Тартуска-Маскоўскай семіятычнай школы, этналінгвістамі.

Параграф, прысвечаны гістарыяграфіі і крыніцам, можа разглядацца як самастойны навуковы нарыс па гісторыі вывучэння міфасемантыкі традыцыйнага культурнага ландшафту беларусаў. У гістарыяграфіі вызначаны асноўныя этапы, акрэслены характар этнаграфічных, фальклорных і лінгвістычных матэрыялаў на кожным з этапаў, дадзена ацэнка канцэптуальным здабыткам і збіральніцкай практыцы.

Сучасны этап даследавання міфасемантыкі прасторы У. Лобач справядліва лічыць найбольш прадуктыўным (с. 70). Годным такой ацэнкі, як нам здаецца, з’яўляецца яго ўласнае даследаванне, якое інтэгруе веды пра ўжо распрацаваныя ў навуцы асобныя прасторавыя кампаненты, істотна ўзбагачае іх, запаўняе паасобныя лакуны, ствараючы адзіную семіятычную сістэму пад назвай «традыцыйны культурны ландшафт беларусаў».

Змест манаграфіі дакладна структураваны, а логіка выкладання развіваецца ад найбольш абстрактных канцэптаў да канктрэтных/базавых элементаў культурнай прасторы: тапаграфія касмагенезу, лакалізацыя *сваёй* і *чужой* прасторы, сімволіка *мяжы* і *цэнтра*, элементы прыроднай сферы ў культурным ландшафце (*лес, балота, рапка, возера, крыніца, поле, гара, камень*), элементы антрапагеннай сферы ў культурным ландшафце (*двор, хата, храм, дарога, вёска, горад, могілкі*).

«Першасная інфармацыя пра карціну свету, культурны ландшафт і яго паасобныя элементы, – піша У. Лобач, – дысперсна і вельмі часта закамуфліравана прадстаўлена ва ўсіх аспектах і формах выяўлення беларускай народнай культуры (мова, фальклор, вераванні, абраднасць, матэрыяльныя артэфакты і інш.), а ўскосным чынам – і ў вонкавых апісаннях (этнаграфічных, гістарычных, краязнаўчых)» (с. 8). Гэты тэзіс не застаецца нерэалізаваным, а шырокі народазнаўчы кантэкст даследавання ствараюць разнастайныя вусныя апавяданні, арыгінальныя легенды і паданні (с. 208–211, 235, 309, 330, 327, 387, 448 і інш.), былічкі, замовы (с. 108, 142, 166, 274, 327–329, 391 і інш.), парэміі (с. 105, 270, 274, 358, 382 і інш.), узоры абрадавай песні, галашэнняў (с. 109,

[1] Лобач У. А. Міф. Прастора. Чалавек : традыцыйны культурны ландшафт беларусаў у семіятычнай перспектыве. – Мінск : Тэхналогія, 2013. – С. 494–496, 509.

234, 240, 266–271, 379, 402 і інш.), апісанні абрадавых, магічных, лекавых, вытворчых практык (с. 110–111, 117, 326, 362–366, 390, 420 і інш.). Пададзены гістарычны і краязнаўчы матэрыял (с. 222, 242–243, 366–367, 378 і інш.), лінгвістычныя звесткі (с. 27, 109, 162, 259, 350 і інш.) і ўласна «этнаграфія» ў традыцыйным разуменні.

Мы не ставім на мэце ацаніць навуковы патэнцыял усёй кнігі У. Лобача, акрэслім у агульных рысах змест некаторых частак. Даследуючы сімволіку мяжы і міфалогіі прасторы (с. 106–123), аўтар сцвярджае, што менавіта наяўнасць мяжы вызначае «свой» свет у прасторы, робіць яго цэльным, сутнасна адрозным ад іншых фрагментаў Космасу (с. 106). Пры гэтым гетэрагеннасць міфалагічнай прасторы актуалізуе міфалагему мяжы не толькі ў значэнні вонкавага перыметра «свайго» свету, але і ў адносінах да кожнага топасу прыроднага ці культурнага паходжання. Такім чынам, культурны ландшафт, піша аўтар, характарызуецца трансгранічнасцю – складанай сістэмай межаў. «Межавая» семантыка *берага ракі (ручая), лесу ці балота* выяўляецца аўтарам на прыкладах парэмій, замоў, народна-медыцынскіх практык; міфасемантыка *мяжы поля* раскрываецца на прыкладах лекавых практык, каляндарных і аказіянальных абрадаў, павер'яў і забарон. «Сваю» прастору таксама выразна лімітуе і *плот (агароджа, тын)*, што ўвасабляецца, паводле У. Лобача, у розных відах магічных практык, у тым ліку варажбе, а таксама ў абрадавых дзеяннях, калядных, валачобных і купальскіх песнях. Аналіз сімволікі мяжы ў кантэксце культурнага ландшафту дае падставы аўтару рабіць абгрунтаваную выснову, што шчыльная і канцэнтраваная сістэма межаў забяспечвае пастаянную магчымасць аператыўнай і эфектыўнай камунікацыі чалавека і свету, што «гарантуе стабільнасць касмічнага парадку ў цэлым» (с. 123).

Выдатным, на наш погляд, прыкладам аналітыкі і канструявання навуковага тэксту з'яўляецца параграф «Паселішча памерлых. Могілкі» (складае 30 старонак). У ім доказна сцверджана сімвалічная тоеснасць «магілы» і «дома», акрэслена лакалізацыя «паселішча памерлых» у структуры культурнага ландшафту, увага чытача акцэнтуецца на іх сакральным статусе і амбівалентнай прыродзе. У. Лобач выкладае цэлую «этнаграфію калектыўных пахаванняў», у якой свая архітэктура, рытуалы і рэгламентацыі, магічныя практыкі і атрыбуты. Тут знаходзім, напрыклад, цікавыя звесткі пра абрад *Прыкладзін* (с. 415–417), пра практыку пахавання самагубцаў, вераванні ў «старажоўства» памерлых (с. 406–408) і іншае.

Традыцыйна дасведчаным выглядае аўтар у тэмах, якія выходзяць на сакральную геаграфію, народную медыцыну, гісторыю старажытнасці і новага часу, этнаканфесійныя характарыстыкі.

У моўных адносінах аўтарскі тэкст вельмі культурны, добра вычытаны. Выключэнне складае толькі непаслядоўнае напісанне лексемы *возера* як *азяро́* (родн. склон – *азяра́*), якое сустракаецца ў параграфе «Гідраграфія культурнага ландшафту ў семіятычнай перспектыве». На думку аўтара рэцэнзіі, не заўсёды апраўдана ўжыванне калькаванай з германскіх моў сінтаксічнай канструкцыі з формаўтваральным дзеясловам *ёсць*: «…асаблівасці прыроднай прасторы, якія *ёсць* своеасаблівай "візітнай карткай" Беларусі» (с. 259); «у рамках лакальнай супольнасці прыярытэтнай *ёсць* мікратапанічная сетка» (с. 258) і іншае. Відавочна, што У. Лобач імкнецца пазбягаць калькаванага з рускай мовы слова *з'яўляецца*. У той жа час стылістычна апраўданае ўжыванне аўтарам слова *даследнік*, а не *даследчык*, *ровень*, а не *ўзровень*, *засвет*, а не *іншасвет*. Заўважаны аўтарскі падыход да графічнага вылучэння аповедаў інфарматараў: тыя тэксты, што ўжо надрукаваны, напрыклад, у выданні «Традыцыйная мастацкая культура беларусаў», даюцца шрыфтам прамога напісання, а тыя, што публікуюцца ўпершыню, вылучаны курсівам. Натуральна, У. Лобач як адзін з найбольш вопытных збіральнікаў захоўвае і перадае моўныя асаблівасці носьбітаў традыцыі. Некаторыя рэдактарскія прэтэнзіі могуць быць выказаны да афармлення цытат з навуковых тэкстаў: не заўсёды пазначаюцца іх пачатак і канец, што робіць цытаванне часам недакладным.

Але пры некаторых нязначных недапрацоўках выданне У. Лобача «Міф. Прастора. Чалавек: традыцыйны культурны ландшафт беларусаў у семіятычнай перспектыве» ўражвае і змястоўнай, і вонкавай грунтоўнасцю. Апошняя адразу ўспрымаецца візуальна: цвёрдая вокладка кнігі, колеры якой разам з пейзажнай выявай ствараюць густоўны, стрыманы паўночна-беларускі каларыт, добрая папера і прашыўка, вялікі аб'ём (510 старонак), калонтытулы, чытабельны шрыфт, шырокія палі і інш. Праца У. Лобача выдадзена на высокім паліграфічным узроўні. Дарэчы,

гэтаму нібыта вонкаваму аспекту – паліграфіі – многія сучасныя аўтары не надаюць належнай увагі, вынікам чаго з'яўляюцца навуковыя выданні ў стракаценькіх і ненадзейных вокладках.

На заканчэнне адзначым, што манаграфія «Міф. Прастора. Чалавек» выяўляе эрудыцыю аўтара, яго пагружанасць у матэрыял і любоў да народнай культуры, якая магла сфарміравацца ў вучонага толькі, як прынята казаць, «у полі». Сапраўды, не толькі тэорыя, але і эмпірыка – моцны бок даследавання. Пры тым, што У. Лобач даўно заявіў пра сябе ў навуцы як пра плённага збіральніка, апублікаваўшы значную колькасць этнаграфічных першакрыніц з Паўночнай Беларусі[1], манаграфія 2013 г. прыемна здзіўляе зместам і колькасцю прадстаўленых у ёй палявых матэрыялаў. Яны ствараюць «голас традыцыі», які надае працы адметны даследчыцкі стыль. Такім чынам, у навуцы пра сябе заяўляе асоба, якая ўсведамляе і асэнсоўвае традыцыю.

*Н. А. Гулак*

---

[1] Полацкі этнаграфічны зборнік. Вып. 1. Народная медыцына беларусаў Падзвіння: у 2 ч. / склад. А. У. Лобач, У. С. Філіпенка. – Наваполацк: ПДУ, 2006; Полацкі этнаграфічны зборнік. Вып. 2. Народная проза беларусаў Падзвіння: у 2 ч. / уклад., прадм. і паказ. У. А. Лобача. – Наваполацк: ПДУ, 2011.